

# ДУХОЎНЫЯ ПРАВАСЛАЎНЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ НА БЕЛАРУСІ (канец XVIII — 60-ыя гг. XIX ст.)


**С.М.Васовіч,**
*асістэнт кафедры філасофіі і культуралогіі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта*



***Да рэформы духоўнай адукацыі пачатку XIX ст. праваслаўныя семінарыі ўяўлялі навучальныя ўстановы, у якіх сумяшчаліся курсы ніжэйшай і сярэдняй духоўнай школы, г.зн. духоўных вучылішчаў і ўласна семінарый. Тым не менш ужо ў гэты час на тэрыторыі пяці паўночна-заходніх губерній былі адкрыты тры самастойныя духоўныя вучылішчы: Бабалуцкае, Невельскае і Гомельскае. Яны ствараліся перш за ўсё для дзяцей свяшчэннаслужыцеляў, аднак у Невельскім і Гомельскім вучылішчах навучаліся дзеці і з іншых саслоўяў.***


Невельская гімназія (вучылішча) была адкрыта ў 1780 г. пскоўскім архіепіскапам Інакенціем (Нячаевым). У I класе («школе») вучылі чытаць і пісаць па-руску і па-польску, спяваць па нотах; у II — выкладалі асновы лацінскай мовы, навучалі арыфметычным дзеянням, знаёмілі з катэхізісам. Малапаспяховых вучняў не пераводзілі з першай «школы» ў другую, а накіроўвалі ў цэрквы псаломшчыкамі. У гімназіі было 10 казённакоштных вакансій, якія дазвалялі ўтрымліваць на дзяржаўныя сродкі найбяднейшых вучняў [1, с. 1—3]. У 1788 г. гімназія была пераведзена ў Полацк, дзе размясцілася пры Багаяўленскім манастыры. Аднак праз 5 гадоў яе вярнулі назад з-за няздольнасці мясцовых свяшчэннаслужыцеляў утрымліваць на ўласныя сродкі сваіх дзяцей у гэтай навучальнай установе і, як вынік, маладлікасці яе навучэнцаў (1 чалавек). У 1804 г. гімназія была перайменавана ў вучылішча.

У 1781 г. была адкрыта Гомельская гімназія. Яе выхаванцы навучаліся чытанню, граматыцы, чыстапісанню, арыфметыцы, вывучалі катэхізіс і правілы для навучэнцаў, для дзяцей духавенства выкладалася лацінская мова [2, с. 54]. Першапачаткова школа ўтрымлівалася на зборы за навучанне. Пасля прылічэння Полацкай губерні да Магілёўскай епархіі Гомельская гімназія атрымала частку сродкаў, якая раней выдзялялася дзяржавай на ўтрыманне навучальных устаноў Полацкай губерні. Пазней школа мела грашовую дапамогу і ад графа Румянцава за права навучання ў ёй дзяцей яго сялян [3, с. 155].

У 1806 г. магілёўскі і віцебскі архіепіскап Варлаам (Шышацкі) дазволіў адкрыць школу пры доме Бабалуцкага святара і Веліжскага благачыннага В.Пятрашні, што і было зроблена 8 студзеня 1808 г. [4, с. 341, 347].

Праваслаўная духоўная адукацыя ў канцы XVIII ст. была вельмі недасканалай. Навучальныя ўстановы праваслаўнага духоўнага ведамства не мелі нават сваіх статутаў, якія вызначалі б усе бакі іх дзейнасці. Таму пры Аляксандры I была праведзена рэформа праваслаўнай духоўнай адукацыі. Усе духоўныя школы па прыкладзе свецкіх навучальных устаноў былі падзелены на чатыры разрады: акадэміі, семінарыі, павятовыя і прыходскія вучылішчы. У кожнай епархіі дапускалася адкрыццё не больш за 10 павятовых вучылішчаў і не больш за 30 прыходскіх школ. Самі ж епархіі былі падзелены на чатыры духоўна-вучэбныя акругі. Мінская епархія ўваходзіла ў Кіеўскую духоўна-вучэбную акругу, а Магілёўская — у Санкт-Пецярбургскую, у якой падрыхтоўчыя работы па пераўтварэнні навучальных устаноў пачаліся ўжо ў 1808 г.

У Магілёўскай епархіі магілёўскі і віцебскі архіепіскап Варлаам першапачаткова меў намер адкрыць 5 павятовых і 15 прыходскіх вучылішчаў. Апошнія ён хацеў стварыць у кожным горадзе Магілёўскай губерні і ў г. Невелі, г. Себежы і с. Бабовая Лука Віцебскай губерні. У Магілёве, Оршы, Гомелі, Мсціслаўлі, Віцебску было запланавана адкрыццё павятовых вучылішчаў [5, л. 2 адв. — 11 адв.]. 23 лютага 1809 г. Камісія духоўных вучылішчаў зацвердзіла зробленыя архіепіскапам Варлаамам прапановы адносна колькасці вучылішчаў і размеркавання паміж імі прыходаў Магілёўскай епархіі. Аднак пры назначэнні настаўнікаў, наглядчыкаў і рэктараў вучылішчаў архіепіскап Варлаам сутыкнуўся з вялікімі цяжкасцямі. З духавенства тых цэркваў, пры якіх намячалася стварэнне вучылішчаў, толькі двое свяшчэннаслужыцеляў аказаліся здатнымі да таго, каб заняць рэктарскую пасаду, і чацвёра — наглядчыцкую. Таму Варлааму давялося перавесці да цэркваў, пры якіх адкрываліся ніжэйшыя духоўна-вучэбныя ўстановы, свяшчэннікаў з іншых прыходаў, а наглядчыкамі двух вучылішчаў прызнацьчыць свецкіх асоб, якіх пасвяцілі ў святары. Усе настаўнікі, за выключэннем трох (свяшчэннікаў), былі ўзяты з ліку выхаванцаў Магілёўскай семінарыі. Архіепіскап Варлаам размеркаваў паміж вучылішчамі вучняў ніжэйшых класаў Магілёўскай семінарыі і дзяцей духавенства (з шасцігадовага ўзросту), дазволіўшы толькі некаторым з апошніх навучацца дома [5, л. 37 адв. — 61, 64]. Магілёўскі і віцебскі архіепіскап выключыў са спісу запланаваных павятовых вучылішчаў Віцебскае, паколькі ў яго набралі толькі трох навучэнцаў, якія былі пераведзены ў Аршанскае павятовае вучылішча. Камісія духоўных вучылішчаў зацвердзіла назначэнне настаўнікаў, наглядчыкаў прыходскіх і рэктараў павятовых вучылішчаў, размеркаванне вучняў і, улічыўшы думку Варлаама наконт Віцебскага вучылішча, распарадзілася адкрыць у студзені 1810 г. 4 павятовыя і 15 прыходскіх вучылішчаў. На працягу першых 17 дзён студзеня гэта прадпісанне было выканана.

| Населены пункт | Назвы паветаў/колькасць прыходаў, прыпісаных да вучылішчаў | Планаваная колькасць выхаванцаў | Першыя кіраўнікі вучылішчаў | Дата адкрыцця вучылішчаў |
|---|---|---|---|---|
| *Павятовыя вучылішчы* | | | | |
| г. Магілёў | Магілёўскі, Быхаўскі, Чавускі | 17 | ігумен Рафаіл | 2.01 1810 г. |
| г. Мсціслаў | Мсціслаўскі, Чэрыкаўскі, Клімавіцкі | 17 | протаіерэй А.Катовіч | 9.01 1810 г. |
| г. Орша | Аршанскі, Бабінавіцкі, Копыскі, г. Сенна і 2 царквы Сенненскага павета | 17 | протаіерэй П.Праскура-Субшчынскі | 9.01 1810 г. |
| м. Гомель | Беліцкі, Рагачоўскі | 20 | протаіерэй І.Грыгаровіч | 16.01 1810 г. |
| г. Віцебск | Невельскі, Веліжскі, Себежскі, 3 царквы Суражскага павета, 2 царквы Рэжыцкага, 2 царквы Люцінскага, 1 царква Лепельскага паветаў, Дзінабургскі сабор, | 3 (пераведзены ў Аршанскае вучылішча) | протаіерэй Пётр Акаловіч | 30.10. 1810 г. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Полацкі сабор і 2 царквы Полацкага павета, Дрызінская гарадская царква з адной павятовай, Віцебскі сабор з батальённай царквой | | | |
| Прыходскія вучылішчы | | | | |
| г. Магілёў | 29 | 26 | протаіерэй І.Важэвіч | 3.01.1810 г. |
| г. Мсціслаў | 20 | 25 | свяшчэннік І.Бекарэвіч | 9.01.1810 г. |
| г. Чэрыкаў | 29 | 43 | свяшчэннік Г.Стратановіч | 9.01.1810 г. |
| м. Дуброўна Аршанскага павета | 31 | 20 | протаіерэй І.Растоўскі | 9.01.1810 г. |
| м. Любавічы Бабінавіцкага павета | 22 | 28 | свяшчэннік І.Кастко* | 9.01.1810 г. |
| г. Чавусы | 30 | 24 | свяшчэннік Ф.Савініч | 11.01.1810 г. |
| г. Быхаў | 24 | 31 | свяшчэннік А.Смоляк | 11.01.1810 г. |
| с. Ута Беліцкага павета | 22 | 36 | свяшчэннік І.Ляплінскі* | 13.01.1810 г. |
| м. Чачэрск Рагачоўскага павета | 25 | 49 | протаіерэй Г.Курганскі | 13.01.1810 г. |
| м. Гомель Беліцкага павета | 23 | 35 | свяшчэннік І.Львоўскі | 17.01.1810 г. |
| с. Бабовая Лука Веліжскага павета | 27 | 21 | свяшчэннік В.Пятрашань | 8.01.1810 г. |
| г. Невель | 25 | 39 | свяшчэннік І.Белімскі | 10.01.1810 г. |
| г. Копысь | 22 | 23 | протаіерэй Н.Бланчонак* | 11.01.1810 г. |
| г. Себеж | 18 | 18 | свяшчэннік Чарны* | 11.01.1810 г. |

* Пазначаны прозвішчы асоб, зацверджаных Камісіяй духоўных вучылішчаў на пасады наглядчыкаў прыходскіх вучылішчаў, але нам невядома, ці выконвалі яны гэтыя абавязкі.

Віцебскае вучылішча было адкрыта толькі 30 кастрычніка 1810 г. Са створаных вучылішчаў толькі 2 павятовыя і 3 прыходскія размясціліся ў будынках, якія належалі духоўнаму ведамству, 3 павятовыя і 11 прыходскіх займалі наёмныя памяшканні, Невельскае прыходскае вучылішча знаходзілася ў манастыры.

Да 1814 г. духоўныя вучылішчы кіраваліся ў сваёй дзейнасці праектамі статутаў, састаўленымі ў 1809 г. архіепіскапам Феафанам. Пасля выпраўлення недахопаў дадзеных праектаў, якія выявіў шасцігадовы вопыт іх прымянення, імператар Аляксандр І 30 жніўня 1814 г. зацвердзіў статуты духоўных прыходскіх і павятовых вучылішчаў. Гэтыя статуты дзейнічалі да пачатку 50-ых гг. XIX ст.

Згодна са статутам 1814 г., у І класе прыходскага вучылішча навучалі чытанню на рускай, царкоўнаславянскай мовах, чыстапісанню па друкаваных прафісях, нотным спевам; у ІІ — чатыром дзеянням арыфметыкі, асновам граматыкі рускай мовы, скарочанаму катэхізісу. Навучанне ў кожным класе доўжылася па годзе. Вучэбны план ніжэйшага аддзялення павятовага вучылішча ўключаў рускую і царкоўнаславянскую граматыку, арыфметыку, царкоўныя спевы, падрабязны катэхізіс, пачатковыя курсы грэчаскай і лацінскай моў. Навучэнцы вышэйшага аддзялення працягвалі вывучэнне катэхізіса, грэчаскай і лацінскай моў, знаёміліся са свяшчэннай гісторыяй, расійскай і ўсеагульнай геаграфіяй. Тэрмін навучання на кожным аддзяленні складаў два гады.

Прыходскія вучылішчы падначальваліся павятовым, а павятовыя — духоўным семінарыям. Унутранае кіраванне духоўнымі вучылішчамі было аднаасобным. Рэктары і наглядчыкі мелі права прадстаўляць семінарскім праўленням кандыдатаў на настаўніцкія пасады і звальняць настаўнікаў за дрэнныя паводзіны, удзельнічалі ў штогадовым экзаменаванні выхаванцаў, састаўлялі канчатковыя спісы вучняў на залічэнне і ўвогуле кіравалі ўсімі ўнутранымі справамі ў даручаных ім вучылішчах.

3 лістапада 1816 г. па загадзе Аляксандра I пачаліся падрыхтоўчыя работы па рэфармаванні навучальных устаноў Кіеўскай духоўна-вучэбнай акругі. Разглядзеўшы прадстаўленне мінскага архіепіскапа, Камісія духоўных вучылішчаў 30 мая 1817 г. пастанавіла «зацвердзіць адно толькі павятовае вучылішча разам з прыходскім пры семінарыі, якую з-за зручнасці мясцовага становішча пакінуць пераважнейшаму ў Слуцку» [6, л. 69]. У выніку на базе Слуцкай духоўнай семінарыі былі ўтвораны ўласна семінарыя, павятовае і прыходскае вучылішчы. У верасні 1817 г. была рэарганізавана Мінская духоўная семінарыя, з двух «запраўных» (пачатковых) класаў якой было створана прыходскае, а з ніжэйшага і вышэйшага граматычных класаў — павятовае вучылішчы. Такім чынам, у ходзе рэформы духоўнай адукацыі пачатку XIX ст. у Беларусі ўзніклі павятовыя і прыходскія духоўныя вучылішчы.

Калі колькасць вучылішчаў, адкрытых у 1810 г. на тэрыторыі Магілёўскай епархіі, перавышала яе патрэбнасці, то духоўныя вучылішчы Мінскай епархіі з 20-ых гг. XIX ст. былі перапоўнены. Таму ў 1834 г. у Мінску былі адкрыты Мінскія павятовае і прыходскае вучылішчы. З 1843 да 1874 г. колькасць вучылішчаў у Мінскай епархіі заставалася нязменнай. Аднак Ляданскае вучылішча і частка вучняў Слуцкага вучылішча былі пераведзены ў г. Пінск, дзе размясціліся ў адным з карпусоў Пінскага Багаяўленскага манастыра. Перавод казённакоштных вучняў Слуцкага вучылішча (вучняў, якія цалкам утрымліваліся за казённыя сродкі) у г. Пінск быў абумоўлены нездавальняючымі жыллёвымі ўмовамі ў гэтым вучылішчы. Прапанова мінскіх епархіяльных архірэяў (Антонія, пасля Міхаіла) перавесці ў Пінск усё вучылішча была адхілена Найсвяцейшым Сінодам з-за выгаднага (цэнтральнага) геаграфічнага становішча г. Слуцка ў Мінскай губерні. Было вырашана пакінуць у Слуцкім вучылішчы толькі сваякоштных вучняў (вучняў, якія цалкам утрымліваліся бацькамі), а епархіяльнаму архірэю пастаўлена ў абавязак паклапаціцца аб паляпшэнні ўмоў іх пражывання. Ляданскае вучылішча было зачынена з-за нездавальняючых жыллёвых умоў і цяжкасцей ва ўтрыманні вучняў. Да пераводу ў г. Пінск гэта навучальная ўстанова нават не мела ўласных будынкаў. У 1844 г. Лядански манастыр даў вучылішчу ў часовае карыстанне пяць невялікіх пакояў у манастырскім будынку для размяшчэння казённакоштных вучняў і асобны драўляны будынак для ўстройвання чатырох класаў. Вучылішча не мела асобных кухні, бальніцы, сталовай, кладоўкі. Харчовыя прыпасы захоўваліся ў наглядчыка вучылішча, на яго ж кухні вучням рыхтавалася гарачая ежа. Толькі малалікае (былое уніяцкае) Бажынскае вучылішча працягвала існаваць аж да 1874 г., паколькі ўтрымлівалася яно не на сінадальныя сродкі, а на працэнты з 3090 руб., якія пакінуў у спадчыну вучылішчу яго заснавальнік свяшчэннік С.Аксінькевіч [14, с. 223].

Пасля ўтварэння Полацкай епархіі (1833) дзякуючы хадайніцтву полацкага епіскапа Смарагда (Крыжаноўскага) у 1835 г. былі створаны Полацкія павятовае і прыходскае вучылішчы. Полацкае і Віцебскае павятовыя вучылішчы першапачаткова падпарадкоўваліся Магілёўскай духоўнай семінарыі. У 1840 г. яны перайшлі ў падначаленне Полацкай семінарыі, куды пасля зраўноўвання вучэбных курсаў уніяцкіх і праваслаўных навучальных устаноў маглі паступаць выпускнікі праваслаўных павятовых вучылішчаў Полацкай епархіі.

У духоўных вучылішчах Літоўскай епархіі ў 40-ых гг. XIX ст. адбылося пераразмеркаванне казённакоштных вакансій і значнае павелічэнне іх колькасці. Да гэтага часу ў кожным з пяці падведамных Літоўскай семінарыі вучылішчаў утрымлівалася па 20 казённакоштных вучняў. Літоўскі мітрапаліт Іосіф (Сямашка) прапанаваў набіраць у Бярэзвіцкае, Кобрынскае, Супрасльскае вучылішчы толькі сваякоштных вучняў, а ў Жыровіцкім і Віленскім (адкрыць замест Барунскага) стварыць адпаведна 150 і 100 месцаў для вучняў, якія б

навучаліся за кошт казны. Неабходнасць для Літоўскай епархіі такой вялікай колькасці казённакоштных вакансій мітрапаліт Іосіф тлумачыў тым, што мясцовае праваслаўнае духавенства атрымлівала са сваіх прыходаў мала грашовых паступленняў па прычыне шматлікасці неправаслаўнага насельніцтва епархіі. Да таго ж яе свяшчэннаслужыцелі мелі больш выдаткаў з-за вялікіх памераў сваіх прыходаў, іх аддаленасці ад епархіяльнага начальства, да якога яны звярталіся, і духоўных вучылішчаў, дзе выхоўваліся іх дзеці. 100 ранейшых казённакоштных вакансій у духоўных вучылішчах епархіі было недастаткова нават для свяшчэннаслужыцельскіх сірот. Таму дзеці псаломшчыкаў вельмі рэдка атрымлівалі адукацыю. Між тым у Літоўскай епархіі адчуваўся недахоп падрыхтаваных дзячкоў. Пад уздзеяннем гэтых довадаў прапановы мітрапаліта Іосіфа былі зацверджаны [15, с. 280]. У выніку ў Кобрынскім і Гродненскім (адкрытым замест Супрасльскага) вучылішчах займаліся ў асноўным сваякоштныя вучні. Тым не менш і ў гэтых вучылішчах у 60-ых гг. XIX ст. былі выхаванцы, якія ўтрымліваліся на сродкі, выручаныя духавенствам ад продажу венчыкаў і лістоў дазвольнай малітвы. Так, у 1864 г. у Кобрынскім вучылішчы займалася 6, у Гродненскім — 5 такіх навучэнцаў.

У пачатку 50-ых гг. XIX ст. была ажыццёўлена рэформа духоўных вучылішчаў. Былі ліквідаваны прыходскія вучылішчы, а ў павятовых па прыкладзе праваслаўных духоўных семінарый створаны 3 аддзяленні: ніжэйшае, сярэдняе і вышэйшае — з двухгадовым тэрмінам навучання кожнае. Фактычна ніжэйшае аддзяленне пераўтворанага вучылішча адпавядала быламу двухкласнаму прыходскаму вучылішчу, сярэдняе і вышэйшае — ніжэйшаму і вышэйшаму аддзяленням ранейшых павятовых вучылішчаў. Пераўтвораны быў і вучэбны курс: уведзены два новыя прадметы (тлумачэнне евангелля і руская гісторыя), зменена колькасць вучэбных гадзін, ажыццёўлена перастаноўка прадметаў. Той, хто паступаў у вучылішча, ужо абавязаны быў ведаць табліцу множання і некаторыя малітвы, умець чытаць па-руску і па-царкоўнаславянску, пісаць па-руску. Таму, напрыклад, на ніжэйшым аддзяленні ў параўнанні з ранейшым прыходскім вучылішчам скарачалася колькасць гадзін на рускую мову.

Асаблівасцю праваслаўнай духоўнай адукацыі на Беларусі ў 30-ых — пачатку 50-ых гг. XIX ст. было існаванне пры некаторых семінарыях дзячкоўскіх вучылішчаў. Прычынай іх стварэння з'явілася пастанова сабора уніяцкіх іерархаў ад 7 лютага 1834 г. аб аднаўленні ва уніяцкіх цэрквах богаслужэння грэка-ўсходняй царквы. З-за поўнай непрыгоднасці наяўных дзячкоў узнікла вострая патрэбнасць у падрыхтаваных псаломшчыках. Да таго ж большасць цэркваў Літоўскай епархіі ўвогуле не мелі царкоўных служкаў. Таму з мэтай падрыхтоўкі псаломшчыкаў у 1834 г. было адкрыта дзячкоўскае вучылішча пры Літоўскай семінарыі, 5 снежня 1838 г. — пры Полацкай семінарыі [16, с. 24]. І калі першае спачатку было злучана з прыходскім вучылішчам, то другое мела асобны вучылішчны статут. Псаломніцкія вучылішчы былі арганізаваны і пры манастырах: у Полацкай епархіі — пры Бярэзвіцкім (на 12 чалавек), Вярбілаўскім (на 8), Аршанскім (на 8 вучняў), у Літоўскай епархіі — пры Тараканскім манастыры [16, с. 24].

У жніўні 1845 г. Полацкае дзячкоўскае вучылішча было пераведзена ў Полацкі Багаяўленскі манастыр, а ў 1849 г. па рашэнні Найсвяцейшага Сінода закрыта. У хуткім часе перастала існаваць і Жыровіцкае псаломніцкае вучылішча. У пачатку 50-ых гг. XIX ст. замест дзячкоўскіх вучылішчаў былі створаны псаломніцкія класы з двухгадовым тэрмінам навучання пры некаторых павятовых вучылішчах. Яны прызначаліся для вучняў, якія не пераводзіліся на вышэйшае аддзяленне вучылішча, а таксама для жадаючых навучацца (15—17-гадовага ўзросту), падрыхтаваных дома. Вучэбная праграма дзячкоўскіх класаў уключала падрабязны катэхізіс з тлумачэннем евангелля, кароткую свяшчэнную гісторыю, царкоўны статут і кароткае вучэнне аб богаслужэбных кнігах, царкоўных святах, абрадах, рэчах, царкоўныя спевы, рускую і царкоўнаславянскую мовы, чыстапісанне, пісьмаводства, расійскую гісторыю і геаграфію, арыфметыку. У Літоўскай епархіі псаломніцкія класы былі арганізаваны пры Віленскім і Жыровіцкім вучылішчах, у Мінскай — пры Пінскім духоўным вучылішчы (з 1854 г.). Працягласць навучання ў пінскім дзячкоўскім класе хісталася ад 2 да 6 гадоў [17, с. 4]. З 1858 г. пры Пінскім вучылішчы існаваў яшчэ і падрыхтоўчы клас,

у якім дзеці духавенства Мінскай епархіі мелі магчымасць рыхтавацца да паступлення ў павятовыя вучылішчы. У гэтым класе было 20 казённакоштных вакансій для свяшчэннаслужыцельскіх дзяцей-сірот. Навучанне і ўтрыманне астатніх вучняў гэтага класа аплачвалі іх бацькі. Выпускнікі, не паспеўшыя да 12 гадоў паступіць на ніжэйшыя аддзяленні павятовых вучылішчаў, пераводзіліся толькі ў дзячкоўскі клас [18, л. 1—4]. Пасля пастановы Найсвяцейшага Сінода (ад 16 мая 1869 г.) аб замяшчэнні псаломніцкіх вакансій толькі асобамі, якія атрымалі багаслоўскую адукацыю, значэнне дзячкоўскіх класаў змяншаецца. 31 жніўня 1869 г. па рашэнні Найсвяцейшага Сінода псаломніцкі клас пры Пінскім вучылішчы быў закрыты, а замест яго створаны падрыхтоўчы клас пры Слуцкім духоўным вучылішчы.

Арганізацыя вучэбнага працэсу ў праваслаўных духоўных вучылішчах была вельмі недасканалай. Вынікі навучання не адпавядалі затрачанаму на яго часу. У духоўных вучылішчах не было ніводнага прадмета, пра які можна было б сказаць, што ён добра выкладаецца. Прычынамі таму былі і недахоп вучэбных дапаможнікаў, і адсутнасць як пэўных праграм выкладання, так і хоць якой-небудзь педагагічнай адукацыі і прадметнай спецыялізацыі ў настаўнікаў (да сярэдзіны 60-ых гг. XIX ст.). Іх неваладанне методыкай, няўменне тлумачыць матэрыял прыводзіла да таго, што ў вучылішчах панавала зубрэнне, механічнае, неасэнсаванае завучванне. Адмоўна ўплывала на якасць навучання і тое, што настаўнікі часта вымушаны былі выкладаць адразу некалькі розных прадметаў (прычым пералік іх мог мяняцца), а таксама сумяшчаць настаўніцкія абавязкі са свяшчэннаслужыцельскімі, што асабліва шырока практыкавалася ў Пратасаўскую эпоху (40—50-ыя гг. XIX ст.). Усё гэта, а таксама надзвычай нізкае жалаванне было прычынай уцёкаў многіх настаўнікаў з духоўна-вучэбных устаноў, што прыводзіла да частай змены ў вучылішчах выкладчыкаў тых ці іншых прадметаў. Вучняў не заахвочвала да старannай вучобы тое, што вельмі рэдкім было выключэнне з вучылішча з-за непасяховасці. Гэта адбывалася толькі ў выпадках поўнай нездавальнасці да навучання ў спалучэнні з вялікаўзроставасцю. Не выключаліся нават тыя вучні, якія шматразова ўцякалі з вучылішча. Гэта прыводзіла да ўкаранення звычкі вучыцца «як-небудзь», «наўдачу», «абы толькі перацягнуцца з класа ў клас».

Да 70-ых гг. XIX ст. не лепшым у духоўных вучылішчах быў і стан выхаваўчага працэсу. Настаўнікі не клапаціліся аб развіцці творчых здольнасцей навучэнцаў. Іх выхаваўчыя намаганні былі накіраваны не столькі на фарміраванне гуманнай, высокамаральнай асобы, колькі на выпрацоўку ў вучняў умення дэманстраваць адпавядаючыя іх будучаму статусу рысы характару і манеру паводзін (набожнасць, пашану да начальства, сціпласць, добрапрыстойнасць). Увогуле выхаванне ў вучылішчах у дадзены перыяд у асноўным зводзілася да навядзення знешняй дысцыпліны. Парадак у духоўных школах падтрымліваўся строгімі спагнаннямі — ад слоўных вымоў да пакарання розгамі. Прычым розга была самым распаўсюджаным сродкам выхавання і навучання. Насільнае культываванне ў выхаванцах духоўных вучылішчаў вышэйпералічаных якасцей характару рабіла іх крывадушнымі. Набожнымі і паслухмянымі яны былі не праз свае ўнутраныя перакананні, а знешне, у прысутнасці начальства. Фізічныя пакаранні, празмерная строгасць, ігнараванне індывідуальных асаблівасцей прыводзілі да таго, што большасць выпускнікоў духоўных вучылішчаў былі безыніцыятыўнымі, запалоханымі. Настаўнікі і кіраўнікі вучылішчаў праяўлялі абсалютную непавагу да асобы навучэнца, частымі былі грубыя вокрыкі, лаянкавыя назвы, рукапрыкладства. Пакаранні нярэдка мелі жорсткі характар і прыніжалі годнасць вучняў. Так, у Віцебскім вучылішчы выкарыстоўваліся такія спосабы пакарання навучэнцаў, як чатырохгадзіннае стаянне на каленях у класе, ужыванне ў ежу толькі хлеба і вады, стаянне на каленях у сталовай і паднашэнне ваз. Пад уздзеяннем грубасці, жорсткасці выхавацеляў і выхаваўчых прыёмаў у выхаванцаў фарміраваўся адпаведны тып паводзін. Знешне навучэнцы духоўных школ вылучаліся неахайнасцю, у зносінах адзін з адным і са слугамі праяўлялі грубасць, якая часта даходзіла да цынізму. Такія пакаранні, як выкананне 20 паклонаў у час малітвы, доўгае стаянне на каленях у царкве, штодзённае чытанне за абедам і вячэрай паслання апостала Паўла да яўрэяў, выклікалі ў вучняў абыякавасць да богаслужэння, ахаладжалі іх рэлігійныя

пачуцці. Не выпадкова ў час рэвізіі ў 1837 г. Віцебскага вучылішча інспектарам Магілёўскай духоўнай семінарыі іерамана хам Сафроніем была заўважана ў вучнях «увогуле некаторая нясціпласць і недалікатнасць ... у знешніх іх учынках; асабліва ў царкве пры богаслужэнні не заўважана нічога, што асабліва паказвала б на рэлігійны настрой, належны духоўным выхаванцам» [19, с. 17].

Антыпедагагічным было выкарыстанне ў вучылішчах інстытута «старэйшых». У кожным інтэрнацкім пакоі і над іншымі групамі выхаванцаў назначаліся «старэйшыя» з ліку найбольш добрапрыстойных вучняў. Яны абавязаны былі сачыць за даручанымі ім навучэнцамі дома, у класах і ў цэрквах і расказваць аб іх праступках выкладчыку вучылішча, які адказваў за выхаваўчы працэс.

У многіх ніжэйшых духоўных навучальных установах панавала далёка не бездакорная маральная атмасфера, чаму спрыяла беднасць вучылішчаў. Разбэшчвала вучняў размяшчэнне іх па дамах мяшчан — галоўным чынам бедных гаспадынь. Навучэнцам, якія жылі ў бурсе (інтэрнаце), не было чым пацяшацца ў яе сценах, што падштурхоўвала іх да выдумлення грубых і ганебных забаў. Так, у Віцебскім павятовым вучылішчы звычайнымі з'явамі былі «бойкі бурсакоў паміж сабой і на вуліцы з яўрэямі, пстрычкі і кухталі з боку больш дарослых і моцных, грубыя мянушкі, запалохванне страшнымі апавяданнямі аб мярцвяках і прывідах, лаянка, а ў старэйшых класах — брудныя гутаркі, тытунекурэнне і часам нават выпіўкі». Суровае і нуднае жыццё азлабляла і рабіла жорсткімі многіх вучняў, якія імкнуліся спагнаць злосць на больш слабых [19, с. 40—41].

Такім чынам, у дзейнасці духоўных вучылішчаў Беларусі канца XVIII — 60-ых гг. XIX ст. можна выдзеліць некалькі этапаў: 1) канец XVIII — пачатак XIX ст. — перыяд уключэння вучылішчнага курса ў семінарскую адукацыю і існавання нешматлікіх, недастаткова арганізаваных асобных духоўных вучылішчаў; 2) пачатак XIX ст. — пачатак 50-ых гг. XIX ст. — перыяд дзейнасці прыходскіх і павятовых духоўных вучылішчаў; 3) пачатак 50-ых — 60-ыя гг. XIX ст. — час існавання толькі павятовых вучылішчаў. Вопыт дзейнасці праваслаўных духоўных вучылішчаў яскрава сведчыць аб немагчымасці сфарміраваць развітую асобу ва ўмовах падаўлення індывідуальнасці, ігнаравання здольнасцей дзіцяці, прыніжэння яго асабістай годнасці.


1. *Горючко П.* Материалы для истории Невельской духовной гимназии (1789—1805). — Витебск, 1901. — 27 с.
2. *Белецкий А.* Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования 1803—1832 гг. Отд. третий: Учеб. заведения Витебской и Могилёвской губерний в 1803—1832 гг. — Вильна: Тип. А.Г.Сыркина, 1906. — 148 с.
3. *Горючко П.С.* Материалы для истории Гомельского духовного училища // Могилёвские епархиальные ведомости. — 1903. — № 12. — С. 155—165.
4. *Горючко П.* Боболуцкое духовное училище // Полоцкие епархиальные ведомости. — 1907. — № 10 (неоф.). — С. 341—348.
5. Российский государственный исторический архив (Санкт-Петербург). — Ф. 802, оп. 1, д. 71.
6. РГИА СПб. Ф. 802, оп. 1, д. 1790.
7. РГИА СПб. Ф. 802, оп. 1, д. 729.
8. РГИА СПб. Ф. 802, оп. 1, д. 1412.
9. РГИА СПб. Ф. 8902, оп. 1, д. 4989.
10. РГИА СПб. Ф. 802, оп. 1, д. 3718.
11. РГИА СПб. Ф. 802, оп. 1, д. 4116.
12. РГИА СПб. Ф. 802, оп. 1, д. 5785.
13. РГИА СПб. Ф. 802, оп. 1, д. 9281.
14. *Перепечин В.* Божинское духовное училище // Минские епархиальные ведомости. — 1899. — № 15 (неоф.). — С. 343—351; № 18 (неоф.). — С. 423—442; № 20 (неоф.). — С. 472—547; 1900. — № 1 (неоф.). — С. 4—14; № 2 (неоф.). — С. 32—37; № 9 (неоф.). — С. 165—171; № 10 (неоф.). — С. 186—191; № 12 (неоф.). — С. 223—226; № 15 (неоф.). — С. 255—260; № 16 (неоф.). — С. 271—274.
15. *Извеков Н.* История Литовской духовной семинарии. — Вильно: Тип. Блюмовича, 1892. — 567 с.
16. *Шавельский Г.* Небольшая экскурсия в область прошлого по поводу настоящего // Полоцкие епархиальные ведомости. — 1903. — № 2 (неоф.). — С. 19—26.
17. *Глыбовский Ф.Г.* Пережитое и перечувствованное в Пинском духовном училище Минской губернии (1865—1868). — Брест-Литовск: Тип. И.Кобринца, 1899. — 40 с.
18. Национальный исторический архив Беларуси (Минск). — Ф. 96, оп. 9, д. 42.
19. *Щеглов И.* К столетию Витебского духовного училища. — Витебск, 1911. — 52 с.